


*Рис*. Соотношение источников сообщений БелТА

Таким образом, в освещении белорусских СМИ событий эпидемии COVID-19 можно выделить следующие тенденции: СМИ Беларуси преподносят информацию о событиях в КНР очень деликатно, избегая громких заявлений и непроверенных источников. Основными внешними информационными источниками для белорусских СМИ является российское информагентство ТАСС и китайское национальное информационное агентство Синьхуа. При этом значительное количество информации поступает через ТАСС (47,8 %). Постепенно увеличивается лексико-семантическое поле ключевых слов, являющихся основой заголовочного комплекса и иллюстрирующих контекст на фоне перехода ситуации от эпидемии к пандемии.

## ТЭМА АБАРАНАЗДОЛЬНАСЦІ КРАІНЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ДРУКУ 20–30 гг. XX ст.

***П. Л. Дарашчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*pdoroshhyonok@mail.ru*

У публікацыі разгледжаны матэрыялы друку, прааналізаваны архіўныя дакументы, прысвечаныя тэме ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, падрыхтоўцы дапрызыўнікоў і ўмацавання абараназдольнасці краіны ў 20–30 гг. XX ст.

***Ключавыя словы:*** ваенна-патрыятычнае выхаванне; камандныя кадры; дапрызыўная падрыхтоўка; абараназдольнасць краіны.

# TOPIC OF DEFENSE CAPABILITY OF THE COUNTRY IN THE BELARUSIAN PRESS IN 20–30 YEARS THE TWENTIETH CENTURY

***P. L. Doroshyonok***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: P. L. Doroshyonok (pdoroshhyonok@mail.ru)*

The publication examines the works of the press, analyzes archival document on the topic of military-Patriotic education of young people, training of pre-conscripts and strengthening the country's defense capability in 20–30 years of the twentieth century.

***Key words:*** military-Patriotic education; command personnel; pre-conscription training; national defense capability.

У 20-х – першай палове 30-х гг. XX ст беларуская прэса канцэнтравала сваю ўвагу на знешнепалітычных і ўнутрыпалітычных праблемах, новай эканамічнай палітыцы, беларусізацыі. У меншай ступені друк асвятляў праблемы абараназдольнасці краіны і падрыхтоўкі кваліфікаваных ваенных кадраў, ваенна-патрыятычнага выхавання, хаця палітычная абстаноўка ў Еўропе і свеце заставалася напружанай і вымагала ад беларускіх улад неабходнасці асваення ваеннай справы як у чырвонаармейскіх частках, так і ў асяродку грамадзянскага насельніцтва, дзе на першым месцы знаходзілася якасная дапрызыўная падрыхтоўка моладзі.

Для чырвонармейцаў, якія служылі ў ваенных частках на тэрыторыі Беларусі, з 22 чэрвеня 1921 г. выходзіла газета «Чырвонаармейская праўда» – орган Рэўваенсавета Заходняга фронту. Першым рэдактарам газеты быў прызначаны Радзівон Канстанцінавіч Шукевіч-Траццякоў – дзяржаўны і партыйны дзеяч Беларусі, журналіст, літаратурны крытык. Рэдакцыя да 1939 г. знаходзілася ў Смаленску і неўзабаве пасля ўключэння заходнебеларускіх абласцей (1939 г.) у склад БССР была пераведзена ў Мінск. Як адзначалася ў выданні «Гісторыя беларускай кнігі», «адной з праблем РСЧА 1920-х гг. быў вялікі працэнт непісьменнасці чырвонаармейцаў-прызыўнікоў – службу ў арміі стараліся арганізаваць так, каб навучыць грамаце непісьменных. Дзеля гэтага па замове 2-й Беларускай стралковай дывізіі ў 1926 г. выдадзены

складзены Ю. Пушкевічам «Лемантар дзеля ўзрослых. Апрацаваны для карыстання ў беларускіх часьцях Раб.-Сял. Чырв. Арміі па лемантары С. Баляснага» [1, с. 254].

Асваенне асноў ваеннай справы сярод цывільнай моладзі таксама не адпавядала выклікам часу. З дэфіцытам камандных кадраў царская Расія сутыкнулася яшчэ падчас Першай сусветнай вайны, і тады ў войска сталі прызываць студэнтаў больш як чатырох дзясяткаў ВНУ, якія тэрмінова асвойвалі ваенныя навукі. Але толькі частка былых афіцэраў царскай Расіі прыняла і падтрымала савецкую ўладу, таму праблема падрыхтоўкі кадраў чырвоных камандзіраў у савецкі час заставалася вельмі вострай. Акрамя ваенных ведаў для службы ў РСЧА патрабавалася быць адданым справе будаўніцтва новага грамадства. Ваенна-палітычную падрыхтоўку дапрызыўнай моладзі распачалі партыйныя і савецкія ўлады, камсамольскія арганізацыі, вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы.

У плане асветніцкай работы на ліпень – верасень 1924 г. ЦК ЛКСМБ планаваў правесці шэраг мерапрыемстваў па дапрызыўнай падрыхтоўцы моладзі. Гэта адбылося неўзабаве пасля першага ўзбуйнення БССР, калі да рэспублікі былі далучаны тэрыторыі Віцебшчыны, Гомельшчыны і Смаленшчыны. Плошча БССР павялічылася да 110 223 тыс. кв. км, а насельніцтва – да 4,2 млн чалавек. Для работы з дапрызыўнікамі 1903–1904 гг. нараджэння рыхтаваліся грунтоўна. У жніўні 1924 г. на двухтыднёвыя курсы склікаліся камсамольскія функцыянеры, якія павінны былі забяспечыць правядзенне ідэалагічнай работы сярод дапрызыўнай моладзі, адначасова друкаваліся матэрыялы зборніка «Помощь комсомольцу политруку…», за лета планавалася абсталяваць Ленінскімі пакоямі месцы збору і правесці ў друку шырокую кампанію па асвятленні гэтага мерапрыемства [2].

Разам з тым беларускі друк рэдка і несістэмна асвятляў ваенную тэматыку. Аддзел друку ЦК КП(б)Б у сваім аглядзе прэсы ў 1926 г. адзначаў: «Военные отделы – не частые гости на страницах наших газет. Особенно этим отличается “Звезда”, почти не дающая… военного материала. А ведь она – центральный орган КПБ, по ней равняются все остальные газеты. Никакой системы в проведении военной пропаганды, никакого плана этой работы в большинстве редакций нет. Просто, время от времени, помещаются случайные заметки случайных военкоров. Такие военные кампании, как увольнение и призыв в текущем году, освещались в наших газетах по большей части лишь в форме хроникерских

заметок. Руководящих и агитационных статей было до чрезвычайности мало. Вообще заметно какое-то пренебрежение военными вопросами со стороны наших редакций. Исключение составляет лишь “Беларуская вёска”, где это дело поставлено в общем удовлетворительно, да отчасти, бобруйский “Камуніст”» [3].

На ініцыятыву аддзела друку ЦК КП(б)Б «пераламаць сапраўднае стаўленне рэдакцый да пытанняў абароны, арганізаваць сістэматычна працуючыя ваенныя аддзелы ва ўсіх газетах» вельмі хутка адрэагаваў ЦК Камсамола Беларусі. Заслухаўшы даклад рэдактара «Чырвонай змены», Бюро ЦК ЛКСМБ на пасяджэнні ад 5 чэрвеня 1926 г. прыняло рэзалюцыю: «Вайсковы аддзел зрабіць сталым, змяшчаючы раз у тыдзень. Звярнуць увагу на неабходнасць аб’яднання навакол рэдакцыі групы ваенкараў» [4].

Газета «Савецкая Беларусь» восенню 1927 г. апублікавала матэрыял аб ваеннай падрыхтоўцы студэнтаў у БДУ. На занятках па вышэйшай дапрызыўнай падрыхтоўцы студэнты ўдзельнічалі амаль на ўсе 100 %. Для іх праводзіліся экскурсіі ў Дом Чырвонай арміі, аб’яднаная вайсковая школа прадастаўляла магчымасць студэнцкай моладзі пазнаёміцца з усімі відамі стралковай зброі. У карэспандэнцыі Т. Гурвіч адзначалася, што «значна папоўніўся і вайсковы габінэт, які быў арганізаван у мінулым (1926 г.) і які адыгрывае вялізарную ролю ў справе ваенізацыі». Асаблівай папулярнасцю ў студэнтаў карыстаўся стралковы цір, да якога заўсёды выстройвалася вялікая чарга. З 1927 г. вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка стала абавязковай і для студэнтак. Вайсковую справу ў БДУ ўключылі ў якасці спецыяльнай дысцыпліны ў агульныя вучэбныя планы: «Студэнт зараз з’яўляецца як бы чырвонаармейцам у водпуску», – падкрэслівалася ў публікацыі [5].

Ваенна-патрыятычныя мерапрыемствы праводзіліся нават для саміх журналістаў. Сакратарыят ЦК КП(б)Б на сваім пасяджэнні ад 19.03.1929 разгледзеў пытанне аб вайсковых гульнях адказных работнікаў цэнтральных і акруговых газет БССР. З мэтай паляпшэння «карэспандэнцка-вайсковай падрыхтоўкі» газетных работнікаў у маі таго ж года планавалася правесці тыднёвыя вайсковыя гульні, у якіх меркавалася задзейнічаць «па аднаму работніку акруговых газет і па два работнікі цэнтральных» [6].

Выданнем вайсковай літаратуры ў пачатку 30-х гг. XX ст. займалася Дзяржаўнае ваеннае выдавецтва БССР (ДВВ). Вайсковы сектар ДВБ выдаваў серыі «Бібліятэка командзіра», «Бібліятэка чырвонаармейца»,

«Масавая ваенна-тэхнічная бібліятэка» і інш. У ліпені 1930 г. было створана Літаратурнае аб’яднанне Чырвонай Арміі і флоту (ЛАЧАФ), якое з’явілася важным фактарам павароту савецкай літаратуры да пытанняў абароны Савецкага Саюза. Са студзеня 1931 г. пачалі выходзіць у Маскве орган Цэнтральнага савета і маскоўскага ЛАЧАФ часопіс «ЛОКАФ» (пазней пераўтвораны ў «Знамя»), у Ленінградзе – часопіс «Залп», на Украіне – «Червоний боець» – орган Палітупраўлення Украінскай ваеннай акругі.

У Беларусі ДВВ наладзіла выпуск ваенна-абарончага літаратурна-мастацкага часопіса «Напагатове». Часопіс планаваўся як штомесячны, але на справе выйшла ўсяго шэсць нумароў (тры ў 1932 і тры ў 1933 г.). Тыраж выдання складаў 6 тыс. экз. Адказным рэдактарам стаў член Рэўваенсавета Беларускай ваеннай акругі, начальнік Палітупраўлення БВА Лазар Навумавіч Аранштам. У рэдкалегію часопіса ўвайшлі Андрэй Александровіч, Лукаш Бэндэ (намеснік рэдактара), Ф. Гольдман, Кандрат Крапіва, В. Шапавалаў.

У перадавым артыкуле пад загалоўкам «Напагатове» (1932, № 1) рэдакцыя анансавала праграму часопіса: выкрываць падрыхтоўку капіталістычнага свету да вайны і інтэрвенцыі супраць СССР; асвятляць на сваіх старонках класавую барацьбу замежнага пралетарыяту; пісаць пра рэвалюцыйную барацьбу працоўных Заходняй Беларусі і Украіны; адлюстроўваць сучаснае становішча Чырвонай арміі, штодзённую палітычную і баявую вучобу, садзейнічаць справе баявой падрыхтоўкі часцей БВА і пагранчасцей БССР; весці літаратурную вучобу і кансультацыю пачынаючых чырвонаармейскіх пісьменнікаў; з улікам living рознага нацыянальнага саставу друкаваць мастацкія творы, крытычныя артыкулы на беларускай, украінскай і рускай мовах [7, с. 7–10].

Першы нумар часопіса выйшаў на 124 старонках, аўтарамі літаратурных твораў, вершаў, гумарэсак з’яўляліся В. Каваль, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, А. Отра, І. Сянькевіч, В. Шапавалаў і інш. З першага нумара ў часопісе меліся аддзелы «Крытыка і публіцыстыка», «Бібліяграфія», «Кансультацыя», у наступных з’явіліся рубрыкі «Клубам і эстрадам», «З мінулага».

Нумары часопіса «Напагатове», як правіла, фарміраваліся па распаўсюджанай у тыя гады схеме: адкрываўся часопіс перадавым артыкулам. Артыкулы мелі характэрныя ідэалагічныя загалоўкі: «Пятнаццаць год на варце сацыялістычнай Бацькаўшчыны», (1933, № 1);

«Пяцігодка ўмацавала абарону СССР» (аўтар – К. Я. Варашылаў, 1933, № 2–3). Далей ішлі літаратурна-мастацкія творы, аўтарамі якіх былі пісьменнікі і паэты В. Каваль, М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка, І. Гурскі і інш. У раздзеле «Крытыка і публіцыстыка» друкаваліся артыкулы Н. Свірына («За ленінскі этап абарончай літаратуры», 1932, № 1), А. Стэцкага («Саракагоддзе літаратурнай дзейнасці Максіма Горкага», 1932, № 2), Л. Бэндэ («Беларуская літаратура да 15-й гадавіны Кастрычніка» – з працягам у двух нумарах за 1933 г.) і інш. Намеснік рэдактара часопіса Л. Бэндэ, якога потым назавуць «монстрам аглабельнай крытыкі», у сваіх артыкулах выходзіў далёка за рамкі ваеннай тэматыкі, ушчуваў беларускіх літаратараў за пазіцыі «дробнабуржуазнай уласніцкай абмежаванасці і вузасці», выпрацоўваў афіцыйную «лінію» палітычнай цэнзуры як у дачыненні да пачынаючых літаратараў, так і да класікаў беларускай літаратуры.

Выхад часопіса быў спынены ў 1933 г., здвоены нумар (1933, № 2, 3, люты – сакавік) стаў апошнім. Асноўнай прычынай быў перавод Л. Н. Аранштама з Беларусі на пасаду начальніка Палітупраўлення Далёкаўсходняй ваеннай акругі. Пэўны ўплыў на далейшы лёс беларускага ваенна-абарончага выдання аказала і ліквідацыя Літаратурнага аб’яднання Чырвонай арміі і флоту (ЛАЧАФ) – з перадачай яго спраў і маёмасці ў адзіны Саюз савецкіх пісьменнікаў СССР.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Гісторыя беларускай кнігі: у 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX–XXI стст.) / М. В. Нікалаеў [і інш.]; навук. рэд.: В. В. Антонаў, М. В. Нікалаеў. Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. 436 с.
2. НАРБ. Ф. 63. Оп. 1. Д. 33. Л. 101.
3. НАРБ. Ф. 4. Оп. 16. Д. 42. Л. 13.
4. НАРБ. Ф. 63. Оп. 1. Д. 61, ЛЛ. 38–39.
5. *Гурвіч Т.* Студэнт-чырвонаармеец // Савецкая Беларусь. 1927. 23 ліст.
6. НАРБ.Ф. 4. Оп. 7. Д. 172. Л.145.
7. [Передавая] Напагатове // Напагатове. 1932. № 1. С. 3–10.